УДК 94 (476) „1941“ (045)

*С.Я. Новікаў*

# АБАРОНА БРЭСЦКАЙ КРЭПАСЦІ ЛЕТАМ 1941 ГОДА: У ПОШУКУ ШЛЯХОЎ НАВУКОВАГА ДАСЛЕДАВАННЯ

Аўтар упершыню прадстаўляе крытычны аналіз вынікаў даследавання айчыннымі гісторыкамі асноўных аспектаў гісторыі абароны Брэсцкай крэпасці летам 1941 г. У апошнія дзесяцігоддзі ў навуковы ўжытак уведзена нямала новых і прынцыпова важных дакументаў пра абарончыя баі на брэсцкім крапасным плацдарме. Дзякуючы гэтаму, узніклі больш спрыяльныя ўмовы для істотнага паглыблення гістарычных ведаў, напісання на дакументальнай аснове грунтоўных навуковых прац і, нарэшце, цэласнага асэнсавання не толькі гераічных, але і трагічных старонак гісторыі подзвігу абаронцаў брэсцкай цытадэлі. Даследчык звяртае ўвагу беларускага чытача на важнасць рэканструявання гісторыі баявых падзей, абапіраючыся не толькі на існуючыя з савецкага часу традыцыйныя гістарыяграфічныя ацэнкі, але і на новыя гістарычныя факты з нямецкіх дакументальных крыніц.

## Уводзіны

Беларуская гістарычная навука заўсёды надавала прыярытэтную ўвагу вывучэнню падзей гісторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Падаецца, што за 70 гадоў, якія мінулі з пачатку абароны Брэсцкай крэпасці летам 1941 г., гісторыкам павінна было б хапіць часу для ўсебаковага вывучэння гэтай як трагічнай, так і слаўнай старонкі ваеннай гісторыі. Аднак напісанне гістарычнага даследавання пра абарончыя баі на крапасным плацдарме ў тыя летнія дні пакуль застаецца адкрытым пытаннем для беларускай гістарычнай навукі [1–3].

Асабліва відавочным гэта становіцца на фоне таго, што расійскія навукоўцы зрабілі вельмі прыкметныя крокі ў напісанні на сучасным навуковым узроўні гістарычных даследаванняў (С.С. Смірноў) аб ходзе баявых падзей на тэрыторыі Брэсцкай крэпасці ў чэрвені 1941 г., разгарнуўшы спецыяльную навуковую дыскусію аб нямецкім штурме і савецкай абароне ў Брэст-Літоўску з мэтай стварэння цэльнай карціны баявых падзей на этапе вядзення шматдзённага штурму і наладжванні арганізаванай абароны крэпасці над Бугам [4–6]. Вынікі сучаснага навуковага дыскурсу з’яўляюцца актуальнымі не толькі для ваенных гісторыкаў і аматараў гісторыі вайны, але і прыцягваюць увагу шырокай грамадскасці ў кантэксце вырашэння задач па захаванні ваеннага мінулага як трывалага падмурка нацыянальнай памяці.

## Айчынная гістарыяграфічная традыцыя

Нягледзячы на той відавочны факт, што гісторыя абароны Брэсцкай крэпасці выклікала цікавасць навуковай грамадскасці на працягу ўсяго пасляваеннага часу, у беларускай гістарычнай навуцы ў сілу палітычных і ідэалагічных прычын яна так і не стала прадметам спецыяльнага навуковага даследавання. На працягу двух першых пасляваенных дзесяцігоддзяў паказ гераічнай абароны крэпасці ў Брэсце насіў выключна публіцыстычны і літаратурны характар: галоўная ўвага надавалася толькі некаторым падзеям, выбарачным фактам і асобным імёнам абаронцаў.

Асноўныя палажэнні навуковай канцэпцыі абароны Брэсцкай крэпасці былі сфармуляваны ў пачатку 1960-х гадоў. Падмуркам для іх з’явіўся зборнік успамінаў абаронцаў крэпасці пад назвай «Гераічная абарона». Ва ўмовах адсутнасці дакументальных крыніц сведчанні ўдзельнікаў абарончых баёў сталі практычна адзінай асновай для аднаўлення агульнай карціны легендарнай абароны Брэсцкай крэпасці. Грунтоўную прадмову да кнігі напісаў дырэктар Музея абароны Брэсцкай крэпасці маёр А. Крупеннікаў, які паспрабаваў даць агульную характарыстыку гісторыі абароны,

вызначыць яе храналагічныя рамкі і паказаць колькасныя аспекты абароны, выкарыстоўваючы для гэтага, апроч усяго, і архіўныя матэрыялы фондаў Міністэрства абароны СССР. Аўтар зрабіў агляд тагачаснай айчыннай і замежнай гістарыяграфіі па праблеме і прыйшоў да высновы аб важнасці выкарыстання розных дакументальных крыніц, у тым ліку нямецкага паходжання.

Паводле матэрыялаў прадмовы, абарона Брэсцкай крэпасці падраздзялялася на два перыяды: першы – з 22 чэрвеня да 29–30 чэрвеня (часу генеральнага штурму крэпасці), а другі – з канца чэрвеня да сярэдзіны ліпеня 1941 г. Аўтар пераконваў чытачоў у тым, што апошнія ачагі абароны знаходзіліся на Цэнтральным і Кобрынскім умацаваннях [7, с. 26]. На думку А. Крупеннікава, у абароне Брэсцкай крэпасці бралі ўдзел 7 стралковых батальёнаў 6-й і 42-й савецкіх стралковых дывізій агульнай колькасцю прыкладна 3,5 тысячы чалавек [7, с. 17].

У сваім матэрыяле А. Крупеннікаў не раз аспрэчваў асноўныя палажэнні данясення камандзіра 45-й нямецкай пяхотнай дывізіі Ф. Шліпера аб заняцці Брэст-Літоўска, хоць быў знаёмы з арыгінальным тэкстам гэтага дакумента, а не толькі з яго апублікаванай версіяй. Аднак савецкая гістарычная навука не дапускала магчымасці поўнага выкарыстання патэнцыялу дакументальных крыніц. Размова аб рассакрэчванні дакументаў прынцыповага значэння, у тым ліку ўсіх матэрыялаў пра абарону Брэсцкай крэпасці, у той час ісці не магла.

Матэрыялы, прысвечаныя абароне Брэсцкай крэпасці, у грунтоўных савецкіх акадэмічных выданнях пачатку 1960-х гадоў [8–10] былі падобныя адзін да аднаго. У іх сцвярджалася, што «арганізаваная абарона крэпасці» вялася да 14 ліпеня, у некаторых яе фартах супраціўленне асобных груп і байцоў не спынялася да 20 ліпеня 1941 г. [8, с. 423]. Асобныя групы абаронцаў прадаўжалі барацьбу практычна цэлы месяц. Толькі на трыццаць другі дзень вайны амаль беспрытомны маёр П.М. Гаўрылаў быў захоплены ў палон. Стойкая і мужная барацьба гарнізона Брэсцкай крэпасці на працяглы час скавала буйныя сілы нямецкіх войск, якія колькасна значна пераўзыходзілі сілы абаронцаў крэпасці [9, с. 20].

Навуковая канцэпцыя абароны Брэсцкай крэпасці ўпершыню замацавалася ў «Советской исторической энциклопедии» ў асобным артыкуле «Брэсцкая абарона 1941 г.», дзе гаварылася аб 28-дзённай (з 22 чэрвеня па 20 ліпеня 1941 г.) абароне крэпасці асобнымі падраздзяленнямі 6-й і 42-й савецкіх стралковых дывізій, якія разам з пагранічнікамі складалі гарнізон абаронцаў агульнай колькасцю да 3,5 тысяч чалавек [10, с. 717]. Аднак вядучая роля ў зборы, літаратурнай апрацоўцы і выданні матэрыялаў пра абарону Брэсцкай крэпасці ў той час належала пісьменніку С.С. Смірнову, дзесяцігадовую «літаратурную работу» якога ў 1964 г. завяршыла дакументальная кніга «Брестская крепость». Менавіта на высновы гэтай «літаратурнай работы» абапіраліся ў далейшым савецкія ваенныя гісторыкі. У 1970-я гады асноўныя палажэнні канцэпцыі абароны Брэсцкай крэпасці знайшлі адлюстраванне ў акадэмічным выданні «Гісторыя Беларускай ССР» (1975 г.), аднак колькасць абаронцаў была зменшана да 3 тысяч чалавек [11, с. 122]. Праз два гады ў аднатомным выданні «История Белорусской ССР» гэтая лічба павялічваецца да 3,5 тысяч чалавек [12, с. 371], аднак спасылак на асобнае навуковае даследаванне зроблена не было. Такім чынам, на працягу трох першых пасляваенных дзесяцігоддзяў сфарміравалася навуковая канцэпцыя па вывучэнні подзвігу абаронцаў легендарнай Брэсцкай крэпасці, падмуркам якой з'яўляліся пераважна ўспаміны ўдзельнікаў абароны. Пры гэтым гісторыкі абыходзілі маўчаннем многія факты з данясення камандзіра 45-й нямецкай пяхотнай дывізіі, асабліва лічбы аб агульнай колькасці савецкіх ваеннапалонных, хаця аб трагічным лёсе «большасці» абаронцаў крэпасці, якія ў ходзе абароны трапілі ў нямецкі палон, згадваў С.С. Смірноў яшчэ ў сярэдзіне 1960-х гг.

Адзначым, што ў гэты час легендарны абаронца крэпасці Герой Савецкага Саюза П.М. Гаўрылаў у кнізе ўспамінаў «Сражается крепость», распавядаючы аб сваёй 32-дзённай барацьбе з ворагам на тэрыторыі Кобрынскага ўмацавання, пісаў, што «для полного и всестороннего раскрытия событий, связанных с обороной Брестской крепости, многое придется сделать историкам и научным исследователям» [13, с. 121].

Аўтары прац розных жанраў выявілі адзінства ў поглядах на гісторыю абароны Брэсцкай крэпасці [14]. Гэта падзея была кананізавана як яркі прыклад патрыятызму і масавага гераізму савецкіх воінаў. Канцэптуальнымі сталі ідэалізаваныя тэзісы аб «месячнай абароне гарнізона», «арганізаваным характары абароны Брэсцкай крэпасці», «амаль поўнай гібелі абаронцаў крэпасці» і інш.

У сярэдзіне 1980-х гадоў галоўныя пастулаты савецкай гістарычнай навукі наконт гераічнай абароны Брэсцкай крэпасці былі выкладзены ў энцыклапедыі «Великая Отечественная война 1941–1945 гг.». У асобным артыкуле аб Брэсцкай крэпасці храналагічныя рамкі абарончых баёў вызначаліся з 22 чэрвеня да 20-х дзён ліпеня 1941 г.; удзельнікамі гераічнай абароны называліся падраздзяленні 6-й і 42-й савецкіх стралковых дывізій, 17-га пагранатрада і 132-га асобнага канвойнага батальёна войскаў НКУС агульнай колькасцю каля 3,5 тысяч чалавек. Далей сцвярджалася, што абаронцы стварылі штаб на чале з капітанам І.М. Зубачовым і палкавым камісарам Я.М. Фаміным. Баі ішлі на ўсёй тэрыторыі крэпасці з 22 чэрвеня да канца месяца, гарнізон не толькі адбіваў удары, але і не раз контратакаваў праціўніка. 29–30 чэрвеня выніку агульнага штурму крэпасці былі захоплены шматлікія ўмацаванні. З канца чэрвеня да 20-х дзён ліпеня баявыя дзеянні насілі ў асноўным ачаговы характар; невялікія групы савецкіх воінаў укрываліся ў развалінах і сутарэннях крэпасці і працягвалі ўпартае супраціўленне. Высновы артыкула былі наступныя: 1) абаронцы крэпасці амаль месяц скоўвалі цэлую нямецка-фашысцкую дывізію; 2) большасць абаронцаў загінула ў баях, частка прабілася да партызан; 3) частка знясіленых і цяжка раненых абаронцаў трапіла ў палон [15, с. 110–111]. Крыніцамі для напісання артыкула сталі дакументальная публіцыстыка, літаратурныя матэрыялы кнігі С.С. Смірнова і ўспаміны ўдзельнікаў абароны. Але пры гэтым у спісе крыніц і літаратуры не значылася ніводнага спецыяльнага навуковага даследавання.

У канцы 1980-х гадоў у энцыклапедыі «Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945» з'явіліся некаторыя ўдакладненні адносна баявых дзеянняў у ходзе гераічнай абароны Брэсцкай крэпасці. Там сцвярджалася, што абарона крэпасці савецкімі войскамі ахоплівае перыяд з 22 чэрвеня па канец ліпеня 1941 г. [16, с. 95]. Пры гэтым не тлумачылася, што з'явілася падставай для ўнясення змяненняў у храналагічныя рамкі абароны. Упершыню прыводзіліся колькасныя звесткі аб праціўніку: шматдзённы штурм праводзіла 45-я нямецкая пяхотная дывізія ў складзе каля 17 тысяч салдат і афіцэраў. Непасрэднае ўзяцце крэпасці яна здзяйсняла ва ўзаемадзеянні з 31-й і 34-й пяхотнымі дывізіямі 12-га армейскага корпуса 4-я нямецкай арміі, а таксама з другой танкавай дывізіяй другой танкавай групы Г. Гудэрыяна пры падтрымцы авіяцыі і часцей узмацнення, якія мелі на ўзбраенні цяжкія артылерыйскія сістэмы. Энцыклапедычны матэрыял утрымліваў тэзіс аб тым, што ўпартае супраціўленне савецкіх воінаў і пагранічнікаў дало магчымасць раніцай 22 чэрвеня вывесці з крэпасці прыблізна палову асабовага складу, накіраваць гэтыя сілы ў раёны канцэнтрацыі сваіх часцей, эвакуіраваць раненых. Некалькі інакш падавалася ў артыкуле агульная колькасць абаронцаў – ад 3,5 да 4 тысяч савецкіх воінаў, якія засталіся ў крэпасці на момант яе штурму нямецкімі часцямі. Да ліку новых удакладненняў можна таксама аднесці тое, што толькі за 9 дзён абаронцы крэпасці вывелі са строю каля 1,5 тысяч салдат і афіцэраў праціўніка. У артыкуле канстатавалася, што да канца чэрвеня вораг захапіў большую частку тэрыторыі

крэпасці, а на працягу 29 і 30 чэрвеня гітлераўцы вялі бесперапынны штурм з выкарыстаннем 500- і 1 800-кілаграмовых авіябомбаў. У выніку кровапралітных баёў і вялікіх страт абарона распалася на шэраг ізаляваных ачагоў супраціўлення. Адметна, што галоўнай дакументальнай крыніцай для падрыхтоўкі артыкула сталі матэрыялы фондаў экспазіцыі мемарыяльнага комплекса «Брэсцкая крэпасць-герой».

З прыведзенага аналізу бачна, што савецкія працы па гісторыі гераічнай абароны Брэсцкай крэпасці захоўвалі канцэптуальнае падабенства, утрымлівалі аднолькавыя ацэнкі, погляды і падыходы навукоўцаў да вывучэння гэтай падзеі. Для савецкага этапу даследавання тэмы былі характэрны ўдакладненне і дэталізацыя традыцыйных палажэнняў па гісторыі гераічнай абароны крэпасці, а не вылучэнне новых падыходаў да крытычнага асэнсавання падзей. Агульная схема баявых дзеянняў падчас штодзённай гераічнай абароны Брэсцкай крэпасці засталася практычна некранутай.

Іншая трактоўка баявых дзеянняў пры ўзяцці Брэсцкай крэпасці давалася ў замежнай гістарыяграфіі, і асновай для яе было данясенне камандавання 45-й нямецкай пяхотнай дывізіі аб ходзе ўзяцця Брэст-Літоўска. Хаця ў замежных працах гісторыя штурму як нязначны лакальны, а не адметны франтавы інцыдэнт першых дзён вайны таксама фактычна ігнараваўся. Нагадаем, што ў беларускай гістарыяграфіі данясенне з некаторымі купюрамі ўпершыню было апублікавана ў кнізе «Памяць» толькі ў канцы 1990-х гадоў.

Зварот да матэрыялаў гэтага данясення стаў важнай прыметай новых падыходаў у суверэннай Беларусі [17–19]. У новых навукова-папулярных працах (аднак не спецыяльных навуковых даследаваннях), прысвечаных гісторыі гераічнай абароны Брэсцкай крэпасці летам 1941 г., аўтарамі шырэй выкарыстоўваюцца новыя факты, сведчанні і адкрыцці. Так, у пачатку 2000-х гг. у працы брэсцкіх даследчыкаў была ўпершыню названа колькасць савецкіх воінаў, якія трапілі ў нямецкі палон на другі дзень абароны крэпасці [17, с. 111]. Але па незразумелых прычынах аўтары ўводзяць гэты факт з пэўнымі агаворкамі, як быццам здача ў палон пярэчыла рэальнаму ходу баявых дзеянняў на брэсцкім абарончым плацдарме. З данясення ў аператыўны аддзел Генеральнага штаба сухапутных сіл вермахта вынікае, што да канца чэрвеня 1941 г. толькі з тэрыторыі крэпасці ў нямецкі палон трапіла амаль 6 тысяч чалавек [20, с. 396]. Аднак гэта лічба не знайшла навуковай ацэнкі ў найноўшым акадэмічным даследаванні [21]. Не ўдаецца вызначыць агульную колькасць савецкіх салдат і афіцэраў, якія трапілі ў нямецкі палон у ходзе абароны крэпасці, і з найноўшага навукова-папулярнага выдання «Брестская крепость. Война и мир» [19]. Між тым даследчыцкая каштоўнасць аўтарскай канцэпцыі працы заключаецца ў тым, што фактычна распачаты пошук новых шляхоў паглыблення гістарычных ведаў аб подзвігу абаронцаў Брэсцкай крэпасці ў чэрвені 1941 г.

**У пошуку шляхоў навуковага даследавання**

У 2008 г. у Маскве выйшла праца расійскага гісторыка Р. Аліева «Штурм Брестской крепости» [6], перавыдадзеная ў Расіі ў 2010 г. Навуковая важнасць даследавання заключаецца ў тым, што расійскі гісторык паставіў пад сумненне некаторыя тэзісы, дагэтуль трывала замацаваныя ў свядомасці навукоўцаў і грамадскасці. Падрыхтаваная на аснове значнай базы новых дакументаў, у тым ліку ўпершыню выкарыстаных нямецкіх матэрыялаў, кніга прадстаўляе скрупулёзна адбудаваную карціну штурму ўмацаванняў на абарончым плацдарме Брэсцкай крэпасці салдатамі 45-й нямецкай пяхотнай дывізіі з 22 па 30 чэрвеня 1941 г.

Выхад новага даследавання сведчыць пра тое, што існуючы традыцыйны падыход сёння сутыкаецца з асобным аўтарскім поглядам, на шляху да якога для расійскага гісторыка не існавала цэнзуры, ідэалагічных абмежаванняў і пэўных

партыйных установак. Не сакрэт, што некаторая частка навуковай грамадскасці неадназначна ацэньвае новыя падыходы, гаворыць пра тое, што пераасэнсаванне гістарычных падзей вядзе толькі да стварэння новых міфаў. Але пры адсутнасці навуковых дыскусій не толькі не будзе адбывацца крытычны, але і весціся ўзважаны аналіз новых падыходаў, поглядаў, ацэнак [22–24]. Заўважым, што ў ходзе навуковых дыскусій не ставяцца пад сумнеў гістарычныя факты аб мужнай, гераічнай і самаахвярнай барацьбе абаронцаў Брэсцкай крэпасці летам 1941 г.

На наш погляд, навуковая каштоўнасць працы Р. Аліева заключаецца не толькі ў сінтэзе значнага пласта арыгінальных дакументальных матэрыялаў, але і ў тым, што ход баявых дзеянняў разглядаецца ў кантэксце параўнальнага аналізу новых фактаў і вядомых гістарыяграфічных крыніц. Аўтарскі падыход быў прадвызначаны тым, што ў арсенале доказнай часткі традыцыйных публікацый навукова-папулярнага жанру часам адсутнічалі архіўныя дакументы: практычную аснову прац айчыннай гістарыяграфіі складалі выключна ўспаміны былых удзельнікаў абароны, якія ў сілу неадназначнасці поглядаў аўтараў пакідалі па-за рамкамі паказу баявых дзеянняў як рэальныя прычыны падзей, так і тое, што адбывалася за рамкамі іх поля зроку [5, с. 777].

«Штурм Брестской крепости» істотна выдзяляецца з шэрагу прац, прысвечаных амаль месячнай гераічнай абароне Брэсцкай крэпасці летам 1941 г. У даследаванні аўтар уводзіць ва ужытак новыя дакументальныя факты, адзначаючы, што перад сучаснай ваеннай гістарыяграфіяй стаіць надзвычай важная задача па «адлюстраванні *цэльнай* (выдзелена мной – С. Н.) карціны абароны Брэсцкай крэпасці» [5, с. 11]. Падзяляючы гэту думку, хацелася б дадаць, што напісанне такой карціны беларускімі гісторыкамі магчыма праз падрыхтоўку спецыяльнай фундаментальнай працы, падмуркам для якой маглі б стаць папярэднія публікацыі ўсіх вядомых і малавядомых дакументаў, выкарыстанне новых архіўных матэрыялаў, у першую чаргу замежнага паходжання.

Прыкладам шырокага выкарыстання малавядомых дакументальных матэрыялаў з’яўляецца праца расійскіх даследчыкаў «Брестская крепость. Воспоминания и документы» (М. : Вече, 2010. – 448 с.). Кніга змяшчае 146 упершыню апублікаваных арыгінальных дакументаў адносна баёў, звязаных, з аднаго боку, з нямецкім штурмам крапасных умацаванняў, а з другога – з савецкай абаронай пагранічнага рубяжа ў Брэсце на працягу апошняй дэкады чэрвеня 1941 г.

Знаёмства з новымі расійскімі гістарычнымі працамі пераконвае ў тым, што аб’ектыўнае даследаванне ходу баявых дзеянняў падчас абароны Брэсцкай крэпасці можа весціся толькі з выкарыстаннем максімальна поўнага кола дакументальных крыніц. Патрэбна стопрацэнтнае выкарыстанне ўсёй вядомай на цяперашні час базы дакументаў для пошуку адпаведных навуковых высноў. З’яўляецца недапушчальным замоўчванне матэрыялаў, факт існавання якіх даказаны як айчыннай, так і замежнай гістарыяграфіяй.

Дакументы маюць адметны характар, бо іх выкарыстанне дапамагае ўбачыць рэальную карціну не толькі гераічных, але і трагічных падзей першых дзён Вялікай Айчыннай вайны і даведацца аб малавядомых старонках ваеннай гісторыі Брэсцкай крэпасці. Апрача таго, публікацыя новых дакументаў набліжае чытача да разумення сутнасці прычын, чаму легендарны абаронца Брэсцкай крэпасці Герой Савецкага Саюза П.М. Гаўрылаў у канцы 1970-х гадоў усё яшчэ бачыў патрэбу ў неабходнасці «поўнага і ўсебаковага раскрыцця падзей абароны Брэсцкай крэпасці» [13, с. 121].

Сярод звестак, атрыманых з новых дакументаў, асабліва адметнай з’яўляецца храналогія разгортвання баявых дзеянняў у ходзе ўзяцця абарончага плацдарма крэпасці ў Брэст-Літоўску. Савецкі гарнізон упарта стрымліваў атакі нямецкай пяхоты, мужна трымаючы практычна кожны будынак, кожны каземат, кожны форт. Паводле

дакументальных фактаў, амаль на кожным участку наступлення германскія часці сустрэлі эфектыўна дзеючую агнявую абарону. Разам з тым з данясення і іншых дакументаў вынікае, што з першага дня вайны для немцаў сталі адметным фактам савецкія палонныя, агульная колькасць якіх праз 9 дзён баявых дзеянняў значна вырасла ў параўнанні з самай вялікай групай чырвонаармейцаў, якія трапілі ў палон вечарам 23 чэрвеня 1941 г., калі з 18.30 на ўчастку (паўночны востраў) наступлення 135-га пяхотнага палка здалося ў палон прыкладна 1900 абаронцаў. На трэці дзень абароны крэпасці 2-гі батальён 133-га нямецкага пяхотнага палка заняў паўднёвы востраў, захапіўшы ў палон 1250 савецкіх абаронцаў. Паводле дакументаў, у апошні дзень нямецкага штурму 29 чэрвеня ў палон трапілі 389 чырвонаармейцаў. Пры гэтым вечарам 28 чэрвеня на тэрыторыі крэпасці немцамі былі выяўлены целы «амаль 2000 забітых рускіх» [20, с. 390]. Такім чынам, у ходзе гераічнай абароны Брэсцкай крэпасці пачала пісацца адна з трагічных старонак яе гісторыі, якая па цяперашні час застаецца «белай плямай» у айчыннай гістарыяграфіі. На момант заняцця крэпасці 30 чэрвеня 1941 г. агульную колькасць савецкіх ваеннапалонных (у тым ліку ўзятых у горадзе) складалі 101 савецкі афіцэр і 7122 малодшыя камандзіры і радавыя [25, с. 390]. Падлікі колькасці савецкіх воінаў, якія да канца чэрвеня трапілі ў нямецкі палон і былі забітыя на тэрыторыі крэпасці, праліваюць святло на агульную лічбу абаронцаў, якія заставаліся ў крэпасці ў ходзе яе шматдзённай абароны летам 1941 г.

Зазначым, што новыя дакументы пацвярджаюць тэзіс аб упартых баявых дзеяннях абаронцаў Брэсцкай крэпасці летам 1941 г., што чырвонай ніткай праходзіць праз даследаванні: на сваім шляху часці германскага вермахта фактычна на самым пачатку агрэсіі супраць СССР сустрэлі моцны рубеж супраціўлення, на якім мужна стаялі савецкія воіны розных нацыянальнасцей, выконваючы свой свяшчэнны абавязак па абароне савецкай Радзімы.

**Заключэнне**

Аналіз сучаснага стану айчыннай і замежнай гістарыяграфіі прыводзіць да высновы аб тым, што ў беларускай гістарычнай навуцы даўно наспела неабходнасць правядзення спецыяльнага даследавання, якое б магло даць канкрэтныя і абгрунтаваныя адказы на пытанні, пастаўленыя гісторыяй шматдзённай абароны Брэсцкай крэпасці летам 1941 г. Ключавым неабходна бачыць пытанне, якое насамрэч вынікае з Загада № 1 ад 24 чэрвеня 1941 г., у адпаведнасці з якім перад абаронцамі ставілася задача «арганізаваных баявых дзеянняў», накіраваных, між іншым, не на абарону цытадэлі, а на арганізаваны «неадкладны выхад» з крэпасці яшчэ баяздольных абаронцаў. Вельмі важна вычленіць ключавыя моманты, характэрныя як для нямецкага штурму, так і для савецкай абароны, і адлюстраваць у спецыяльным навуковым даследаванні ход абарончых баёў у Брэсцкай крэпасці з улікам сучасных навуковых ведаў. Такім чынам, удасца на рэшце выканаць наказ не толькі С.С. Смірнова аб напісанні апавяданняў, раманаў і паэм, стварэнні п’ес і кінафільмаў, але і правядзенні «гістарычных даследаванняў» па тэме гісторыі абарончых баёў легендарнага гарнізона Брэсцкай крэпасці летам 1941 г.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны: праблемы гістарыяграфіі і крыніцазнаўства : зб. артыкулаў. – Мінск : Беларус. навука, 1999. – 253 с.

2. Беларусь. 1941–1945. Подвиг. Трагедия. Память : в 2 кн. / Нац. Акад. наук Беларуси, Ин-т истории ; редкол.: А.А. Коваленя (пред.) [и др.]. – Минск : Беларус. навука, 2010. – Кн. 1. – 480 с.; Кн. 2. – 358 с.

3. Новікаў, С. Абарона Брэсцкай крэпасці летам 1941 года / С. Новікаў // Беларуская думка. – 2010. – № 5. – С. 88–97.

4. Алиев, Р. Брестская крепость: взгляд с немецкой стороны / Р. Алиев // Фронтовая иллюстрация. – 2003. – № 5. – С. 1–74.

5. Алиев, Р.В. Штурм Брестской крепости / Р.В. Алиев. – М. : Яуза : Эксмо, 2008. – 800 с.

6. Алиев, Р.В. Брестская крепость. Воспоминания и документы / Р.В. Алиев. – М. : Вече, 2010. – 448 с.

7. Героическая оборона. – 2-е изд., доп. – Минск : Госиздат БССР, 1963. – 598 с.

8. История Белорусской ССР : в 2 т. / Акад. наук БССР, Ин-т истории ; ред. Т.С. Горбунов. – Т. 2. – Минск : Изд-во Акад. наук БССР, 1961. – 702 с.

9. История Великой Отечественной войны Советского Союза 1941–1945 : в 6 т. – Т. 2. Отражение советским народом вероломного нападения фашистской Германии на СССР. Создание условий для коренного перелома в войне (июнь 1941 – ноябрь 1942). – М. : Воениздат, 1961. – 682 с.

10. Советская историческая энциклопедия : в 16 т. / гл. ред. Е.М. Жуков. – Т. 2. – М. : Советская энциклопедия, 1962. – С. 716–717.

11. Гісторыя Беларускай ССР : у 5 т. – Т. 4. Беларусь напярэдадні і ў гады Вялікай Айчыннай вайны Савецкага Саюза (1938–1945 гг.). – Мінск : Навука і тэхніка, 1975. – 640 с.

12. История Белорусской ССР. – Минск : Наука и техника, 1977. – 632 с.

13. Гаврилов, П.М. Сражается крепость / П.М. Гаврилов. – 2-е изд., испр. и доп. – Краснодар : Кн. изд-во, 1980. – 142 с.

14. Бешанов, В.В. Брестская крепость / В.В. Бешанов. – Минск : Беларусь, 2004. – 158 с.; М. : Эксмо, 2009. – 352 с.; М. : Эксмо, 2010. – 352 с.

15. Брэсцкай крэпасці абарона 1941 // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945 : энцыклапедыя / рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1990. – С. 95–97.

16. Брэсцкай крэпасці абарона 1941 // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945 : энцыклапедыя / рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1990. – С. 95–97.

17. Брестская крепость = Brest fortres: факты, свидетельства, открытия / В.В. Губаренко [и др.]. – 2-е изд, испр. – Брест : Академия, 2001. – 84 с.

18. Брестская крепость на ветрах истории / под ред. В.В. Губаренко, Л.А. Цуприка ; авт. концепции и текста А.М. Суворов. – Брест : Редакция журнала СЭЗ, 2004. – 152 с.

19. Брестская крепость. Война и мир / авт. концепции и текста А. Суворов. – Брест : Полиграфика, 2010. – 256 с.

20. Памяць : гіст.-дакум. хроніка Брэста : у 2 кн. – Мінск : БЕЛТА, 1997. – Кн. 1. – С. 325–453.

21. Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941–1945 / А.А. Коваленя (рук. авт. коллектива) [и др.]. – Минск : БЕЛТА, 2005. – 544 с.

22. Новікаў, С. Абарона Брэсцкай крэпасці: традыцыйнае і новае ў гістарыяграфіі / С. Новікаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2010. – № 6. – С. 28–35.

23. Ганцар, К. Штурм Брэсцкай крэпасці / К. Ганцар // Беларускі гістарычны часопіс. – 2010. – № 6. – С. 36–37.

24. Новікаў, С. Узяцце Брэсцкай крэпасці: гістарычны дакумент / С. Новікаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2010. – № 6. – С. 38–43.

25. Алиев, Р.В. Отчет о штурме Брест-Литовска / Р.В. Алиев // Брестская крепость. Воспоминания и документы / Р.В. Алиев. – М. : Вече, 2010. – С. 380–391.

*Novikav S.Y* **Brest Fortress Defence during the summer of 1941 year: Searching the Trace of Research**

It is the first time in the science of our country the author has given critical analysis of the results of the study, dedicated to the most significant aspects of the defence of the Brest Fortress in the summer of 1941. In the last few decades a lot of new and crucially important documents about the defensive acts on the Brest Fortress place of arms have been introduced into scientific usage. Thanks to this there appeared favourable conditions to deepen historical knowledge, to write serious scientific works on the documentary basis, and to evaluate not only heroic but also tragic moments of the history of the deeds of the defenders of the Brest citadel. The researcher draws the attention of the Belarussian reader to the importance of reconstructing war actions, taking into consideration not only the existing traditional soviet historiographical assessment of the events, but also new facts from German documentary sources.

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 02.03.2011